**Культурна-масавыя мерапрыемствы, праведзеныя бібліятэкамі ДУК “Лунінецкая РЦБС” у ліпені**

У бібліятэках Лунінецкай раённай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы адбыліся мерапрыемствы, прысвечаныя **Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь** і да **80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.**

**3 ліпеня. ЦБ і ЦДБ.** У рамках гарадскога свята супрацоўнікі бібліятэк арганізавалі інтэрактыўную пляцоўку “Мая краіна Беларусь!”. Наведвальнікі пляцоўкі маглі пазнаёміцца з кніжнымі выставамі “Детство, опаленное войной», “Беларусь мая сінявокая” і выставай малюнкаў выхаванцаў арт-студыі “В фокусе палитры”, дзе займаюцца дзеці з асаблівасцямі развіцця. Таксама на пляцоўцы адбылася літаратурна-музычная кампазіцыя “Беларусь у маім сэрцы”. У рамках мерапрыемства прайшло ўзнагароджанне пераможцаў анлайн-конкурса чытальнікаўвершаў “О Родине, о мужестве, о славе», прысвечанага 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. У конкурсе прынялі ўдзел прадстаўнікі розных пакаленняў. Пераможцы і ўдзельнікі анлайн-конкурсу былі ўзнагароджаны дыпломамі і падарункамі. А для дзяцей была арганізавана пляцоўка эрудытаў, дзе яны разгадвалі красворды пра Беларусь.

Прайшлі мерапрыемствы і ў сельскіх бібліятэках раёна. Так, у **Кажан-Гарадокскай** сельскай бібліятэцы-клубе адбыўся цыкл мерапрыемстваў, прысвечаных 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў: гістарычная гадзіна “”Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны”, гульня-віктарына “Люблю тебя, Белая, Белая Русь…”, гадзіна памяці “Мы эту память пронесём через года”.

**5 ліпеня. ЦБ.** Цэнтральную раённую бібліятэку наведала дэлегацыя горада-пабраціма Палеска (Расія). Загадчыца адзела абслугоўвання і інфармацыі правяла экскурсію па бібліятэцы, расказала пра розныя напрамкі дзейнасці бібліятэкі, пазнаёміла з дзейнасцю духоўна-асветніцкага цэнтра “Истоки”, народнай літаратурна-паэтычнай студыі “Литературная провинция”, арт-студыі “В фокусе палитры”. Дзякуючы калегам з “МБУК “Міжпасяленчая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма” Палескай муніпацыяльнай акругі фонд цэнтральнай раённай бібліятэкі папоўніўся кнігамі, якія зоймуць дастойнае месца на стэлажах і падораць радасць чытачам. *(Лунінецкія навіны. 2024. 6 ліпеня. С.1)*

Прайшлі мерапрыемствы да **свята Купалле.** Так, **7 ліпеня** у **Дзятлавіцкай сельскай бібліятэцы** прайшло свята “Ясная ночка купальская”, у **Бастынскай с.б.** – тэматычны вечар “Традиции живая нить”, у **Вялікачучавіцкай с.б.** – літаратурна-забаўляльная гульня “Шануючы народныя традыцыі”, у **Люшчанскай с. б.-к.** – літаратурна-музычны вечар “Купалле” і інш.

У рамках святкавання **Дня горада** цэнтральная раённая і цэнтральная раённая дзіцячая бібліятэкі арганізавалі адкрытую бібліяпляцоўку “Чытаючы горад” каля помніка Якубу Коласу.

**13 ліпеня. ЦБ.** Лунінчане маглі пазнаёміцца з кніжнымі выставамі: кніжна-ілюстрацыйная выстава “Лунінец: учора, сёння, заўтра”, выстаўка-партрэт “Імі ганарыцца Лунінец”, кніжная выстава “Лунінеччына літаратурная”, выстаўка-экспазіцыя “Аўтограф на памяць”, кніжная інсталяцыя “Юбілейны торт” і фотазона “ Я люблю Лунінец!”

На бібліятэчнай пляцоўцы прайшоў літаратурны марафон з удзелам паэтаў і краязнаўцаў Лунінеччыны. Пачалася мерапрыемства з прэзентацыі новага зборніка “Строки памяти”, выдадзенага адзелам бібліятэчнага маркетынгу і прысвяцілі яго 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У зборнік увайшлі творы ўдзельнікаў народнай літаратурна-паэтычнай студыі “Литературная провинция”. І канешне шэраг вершаў аўтары прысвяцілі гораду Лунінцу.

**ЦДБ.** Для дзяцей працавала інтэрактыўная пляцоўка, дзе дзеці чыталі, гулялі, адказвалі на пытанні казачнай віктарыны, і маглі сфатаграфавацца з героямі мультфільмаў. Афармілі кніжныя выставы “По книжному морю”, выставу інтэрактыўных і развіваючых сучасных дзіцячых кніг незвычайнага фармату “Эти необыкновенные книги” і выставу лялек Цільда.

**18 ліпеня. ЦБ.** У бібліятэцы прайшла экскурсія з атрымальнікамі сацыяльных паслуг адзялення забеспячэння дзённага знаходжання для грамадзян пажылога ўзросту ДУ “Лунінецкая ТЦСАН”. Галоўны бібліёграф пазнаёміла прысутных з гісторыяй бібліятэкі, кніжным фондам і структурай бібліятэкі, расказала пра напрамкі дзейнасці і паслугі бібліятэкі. Асаблівую цікавасць у экскурсантаў выклікала зала праваслаўнай кнігі і цэнтр прававой інфармацыі.

**19 ліпеня. ЦБ.** У духоўна-асветніцкім цэнтры “Истоки” адбылася гадзіна духоўнасці “Спешите делать добрые дела”. На мерапрыемства запрасілі настаяцеля храма Казанскай іконы Божай Маці (в. Рэдзігерава), іерэя Аляксандра Барысава.

**23 ліпеня. Мікашэвіцкая г.б.** Супрацоўнікі бібліятэкі правялі літаратурную вандроўку “Знаменитые земляки”, прысвечаную 95-годдзю з дня нараджэння беларускага пісьменніка Уладзіслава Нядзведскага. У першыя пасляваенныя гады ён выхоўваўся ў Мікашэвіцкім дзіцячым доме, а потым працаваў там старшым піянерважатым.